**Правапіс прыметнікаў з суфіксам –ск-**
**Урок беларускай мовы ў VI класе**

**В. В. Саўчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска

**Тэма: Прыметнікі з суфіксам -*ск*-, іх правапіс**

**Мэты:** дапамагчы вучням засвоіць правілы вымаўлення і напісання адносных прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса ***-ск-***, удасканальваць уменні ўстанаўліваць разрад прыметніка, утваральную аснову, канцавы зычны, тлумачыць умовы напісання суфікса ***-ск-***, ужываць адносныя прыметнікі ў вусным і пісьмовым маўленні; стварыць умовы для развіцця назіральнасці, творчага ўяўлення, удасканалення ўмення свабодна выказваць свае думкі і абгрунтоўваць свой выбар, пашыраць слоўнікавы запас вучняў; спрыяць фарміраванню патрыятычных пачуццяў.
**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу
**Абсталяванне:** карткі з заданнямі для групавой, індывідуальнай работы, прэзентацыя па тэме, Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 кл.агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання/ В.П.Красней, Я.М.Лаўрэль, С.Р.Рачэўскі.-Мн., 2015.
**Формы работы:**гульня “Даследчая лабараторыя” (работа ў групах, франтальнае апытванне, індывідуальныя заданні).
**Удзельнікі:** кіраўнік лабараторыі (настаўнік), галоўныя кансультанты, лабаранты.

**Ход урока**

1. ***Арганізацыйны момант. Настрой на ўрок.***

(*Вучні з пачатку ўрока размяшчаюцца па групах.)*
**Кіраўнік лабараторыі:** Дзень добры, паважаныя калегі. Сёння мы працягваем працу ў нашай даследчай лабараторыі. Мне, яе кіраўніку, вельмі падабаюцца вашы папярэднія даследаванні ў галіне “Прыметнік”, таму прапаноўваю працягваць працу ў гэтым кірунку. Жадаю ўсім поспеху!
- Давайце пазначым дату працы… сакавіка, і ў нас з вамі будзе сёння класная работа. Запішыце пра гэта ў рабочых сшытках.

2. ***Выклік.***

- Тэму сённяшняга даследавання вы зможаце вызначыць пасля таго, як адкажаце на пытанні краязнаўчай віктарыны.





1. Як называецца наша краіна? *(Беларусь.)*
2. У якім беларускім горадзе ёсць крэпасць-герой? *(Брэст.)*
3. Як называецца тэрыторыя, дзе жывуць палешукі? *(Палессе.)*
4. У якім горадзе нашай рэспублікі вырабляюць смачны квас? *(Ліда.)*
5. Назавіце горад, дзе ёсць папяровая фабрыка, што вырабляе вашы сшыткі. *(Добруш.)*
6. Як называецца Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту? *(Раўбічы.)*
7. Як называецца мемарыяльны комплекс, які быў адкрыты на месцы аднайменнай вёскі, спаленай у гады Вялікай Айчыннай вайны? *(Хатынь.)*




- Ад дадзеных назоўнікаў (Беларусь, Брэст, Палессе, Ліда, Добруш, Раўбічы, Хатынь) утварыце прыметнікі і запішыце ў сшыткі.
- Давайце праверым утвораныя прыметнікі.




*(Беларускі, брэсцкі, палескі, лідскі, добрушскі, раўбіцкі, хатынскі.)*

- Вызначце разрад гэтых прыметнікаў,спосаб і сродак словаўтварэння.

*(Адносныя прыметнікі, утварыліся суфіксальным спосабам пры дапамозе суфікса* ***-ск-****.)*

-Назавіце сярод дадзеных прыметнікі, у якіх вымаўленне не адпавядае напісанню. (Лідскі, добрушскі.)

***3. Фармулёўка тэмы і задач урока.***

-Зыходзячы з папярэдняга матэрыялу, сфармулюйце тэму, над якой вы будзеце сёння працаваць.

*(Прыметнікі з суфіксам* ***-ск-****, іх правапіс).*



-Як вы думаеце, чаму вы павінны навучыцца, чым авалодаць у працэсе вывучэння дадзенай тэмы? Акрэсліце задачы сваёй працы.







*(1.Пазнаёмімся з правіламі ўтварэння і правапісу адносных прыметнікаў з суфіксам* ***-ск-****.*
*2. Авалодаем уменнем ужываць дадзеныя адносныя прыметнікі ў вусным і пісьмовым маўленні.*
*3. Удасканалім уменне самастойна рабіць вывады, прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы.)*

***4. Праца над матэрыялам § 39.***

- Нагадваю, што на пачатку любога даследавання трэба разгледзець і прааналізаваць усю неабходную літаратуру. Таму давайце звернемся да вучэбнага дапаможніка:

- *аналіз утварэння, вымаўлення і спосабу перадачы на пісьме адносных прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса* ***-ск- (пр.239),***
- *суразмоўніцтва па пытаннях* ***с.138-139*** *(паралельна).*
- А зараз я прапаную вам самастойна прачытаць вучэбны тэкст на **с.139** і вывесці **формулы** ўтварэння і правапісу прыметнікаў з суфіксам ***-ск-***.
*(Кожная група атрымлівае сваю мікратэму.)*
*-замацаванне тэарэтычнага матэрыялу па вучэбным тэксце дапаможніка с. 139 (самастойнае чытанне)*
*-вывад формул "Прыметнікі з суфіксам* ***-ск-****, іх правапіс"(па групах)*

***1група.*** *Правапіс прыметнікаў, якія ўтвораны* ***ад назоўнікаў з асновай на Т,Ц,Ч,К*** *і* ***ад назоўнікаў з асновай на Д***

**т** + ск = **цк** брат + ск = бра**цкі**
**ц** + ск = **цк** краве**ц**+ ск = краве**цкі**
**ч** + ск = **цк** тка**ч** + ск = тка**цкі**
**к** + ск = **цк** маста**к** + ск = маста**цкі**

**д** + ск = **дск** сусе**д** + **ск** = сусе**дскі**

***2 група.*** *Правапіс прыметнікаў, якія ўтвораны* ***ад геаграфічных назваў, назваў нацыянальнасцей, народнасцей з асновай назоўніка на зычны,*** *якія перад суфіксам* ***-ск-****захоўваецца*

**г** + ск = **гск** Таганро**г** + **ск** = таганро**гск**і

**х** + ск = **хск** каза**х** + **ск** = каза**хск**і

**к** + ск = **кск** узбе**к** + **ск** = узбе**кск**і

**з** + ск = **зск** Каўка**з** + **ск** = каўка**зск**і

**ж** + ск = **жск** Нясві**ж** + **ск** = нясві**жск**і

**ш** + ск = **шск** Добру**ш** + **ск** = добру**шск**і

**АЛЕ:** Вол**г**а + **ск** = вол**жск**і

Ры**г**а + **ск** = ры**жск**і **г//ж**

**ВЫКЛЮЧЭННІ!** калмы**к** + **ск** = калмы**цк**і

тура**к** + **ск** = турэ**цк**і **к//ц**

чэ**х** + ск = чэ**шск**і **х//ш**

***3 група.*** *Правапіс прыметнікаў, якія ўтвораны ад назоўнікаў з асновай на* ***С, Ш*** *і* ***ад назваў месяцаў на -НЬ і назоўніка ВОСЕНЬ***

**с** + ск = **ск** белару**с** + **ск** = белару**ск**і

**ш** + ск = **ск** тавары**ш** + **ск** = тавары**ск**і

**нь** + ск = **ьск** чэрве**нь** + **ск** = чэрве**ньск**і

(Чэрве**ньск**і раён)

**восе**нь + **ск** = восе**ньск**і

- *выступленне моваведаўцаў з кожнай групы*

***5. Замацаванне ведаў, уменняў і навыкаў.***

- *складанне алгарыму*

- Давайце паспрабуем узгадаць, якія крокі мы павінны ажыццявіць, каб правільна напісаць прыметнік з суфіксам *-ск-*.







***1. Вызначыць, ад якога назоўніка ўтвораны прыметнік.***

***2. Выдзеліць графічна аснову назоўніка, якая заканчваецца на зычны.***

***3. Узгадаць схему ўтварэння прыметніка з суфіксам -ск-, выкарыстаць яе ў адносінах да слова.***

- Прапаную перайсці да практычнай часткі даследавання. Давайце паназіраем, як "паводзіць сябе" суфікс *-ск-* у розных умовах.

*-калектыўнае выкананне* ***пр.240*** *(вызначэнне разраду, утварэння і правапісу выдзеленых прыметнікаў)*

**Фізкультхвілінка**

- *выкананне заданняў у групах*

- А зараз я прапаную вам **эксперымент – укараніць суфікс** *-ск-* у прапанаваныя прыметнікі.



**Устаўце прапушчаныя літары ў адпаведнасці з правіламі напісання суфіксаў прыметнікаў.**

1. Першую палес...ую вясну сустракаў тут Лабановіч.
2. Журботна пазіралі далечы і ніклі ў святле жнівен...ага сонца.
3. Максім любіў весці размовы на грама…ія тэмы.
4. Два дні ішоў цёплы красаві…і дождж.
5. Старыя пройдзены дарогі і сцежак тысячы лю…іх.
6. Адной з жамчужын беларускай архітэктуры па праву лічаць Нясві…і замак, які цудоўна захаваўся і да нашага часу.

1. Першую палес*к*ую вясну сустракаў тут Лабановіч.
2. Журботна пазіралі далечы і ніклі ў святле жнівен*ьск*ага сонца.
3. Максім любіў весці размовы на грама*дск*ія тэмы.
4. Два дні ішоў цёплы красаві*цк*і дождж.
5. Старыя пройдзены дарогі і сцежак тысячы лю*дск*іх.
6. Адной з жамчужын беларускай архітэктуры па праву лічаць Нясві*жск*і замак, які цудоўна захаваўся і да нашага часу.

*(калектыўная праверка па 2 сказы)*




-Увага! Толькі што на электронную пошту нашай лабараторыі прыйшло паведамленне, што ў хуткім часе мы будзем прымаць удзел у практычнай канферэнцыі за мяжой. Але паедзе толькі адна група, таму зараз мы праверым, як вы ўмееце хутка мабілізаваць свае веды па тэме і аператыўна выконваць заданне.




Прапануецца **эстафета “Утварыць. Запісаць. Паспець.”**.

**<u>На дошцы:</u>**

Флот *флоцкі* гігант *гіганцкі* шавец *шавецкі*

Адэса *адэскі* Вільнюс *вільнюскі* Канада *канадскі*
француз *французскі* Парыж *парыжскі* Белавежа *белавежскі*
юнак *юнацкі* купец *купецкі* сусед *суседскі*
конь *конскі* Хатынь *хатынскі* восень *восеньскі*
узбек *узбекскі* таджык *таджыкскі* кіргіз *кіргізскі*
Палессе *палескі* Добруш *добрушскі* Рыга *рыжскі*
турыст *турысцкі* жнівень *жнівеньскі* Баранавічы *баранавіцкі*
Нясвіж *нясвіжскі* салдат *салдацкі* рыбак *рыбацкі*




-SOS! У нашай лабараторыі з’явіліся **вірусы**,якія пашкодзілі прыметнікі. Гэта перашкаджае даследаванню. Неабходна хутка знішчыць вірусы, каб працягваць працу далей.

**1.Знайдзіце і выпішыце прыметнікі з дапушчанымі памылкамі, выпраўце памылкі. Абгрунтуйце сваю думку.**

Беларускі, сусецкі, нясвішскі, мастацкі, сакавітскі, турыстскі, салдацкі.

**2. Знайдзіце і выпішыце прыметнікі з дапушчанымі памылкамі, выпраўце памылкі. Абгрунтуйце сваю думку.**

Казахскі, таджыцкі, паляшукскі, фашытскі, адвакацкі, ткачскі, баранавіцкі.

**3. Знайдзіце і выпішыце прыметнікі з дапушчанымі памылкамі, выпраўце памылкі. Абгрунтуйце сваю думку.**

Слуцкі, студэнтскі, смалявічскі, казакскі, палесскі, кравецкі, гарацкі.

***Адказы:***

беларускі, **суседскі**, **нясвіжскі**, мастацкі, **сакавіцкі**, **турысцкі**, салдацкі.

казахскі, **таджыкскі**, **паляшуцкі**, **фашысцкі**, адвакацкі, **ткацкі**, баранавіцкі.

слуцкі, **студэнцкі**, **смалявіцкі**, **казацкі**, **палескі**, кравецкі, **гарадскі**.



- І зноў на электронны адрас лабараторыі прыйшло паведамленне. Калегі з Расіі просяць дапамагчы **перакласці прыметнікі з рускай мовы на беларускую**.
Барановичский, соседский, чешский, парижский, словацкий, братский, брестский, июльский, матросский, лидский, полесский, калмыкский.
Баранавіцкі, суседскі, чэшскі, парыжскі, славацкі, брацкі, брэсцкі, ліпеньскі, матроскі, лідскі, палескі, калмыцкі.







- Не сакрэт, што ў хуткім часе вас запросяць да супрацоўніцтва з іншымі лабараторыямі за мяжой. Дзе пабываеце і з кім пазнаёміцеся, вы даведаецеся, калі працягнеце **ланцужок “Горад – краіна – нацыянальнасць – прыметнік”**.




*Прыклад: Мінск – Беларусь – беларус – беларускі.*
Рыга – … – латыш – … .
Прага – Чэхія – … – … .
… – Францыя – француз – … .
Ташкент – … – узбек – … .
Душанбе – Таджыкістан – … – … .
Астана – … – казах – … .
Берлін – … – … – … .
*(праверка)*
**Слайд**






Рыга – *Латвія* – латыш – *латышскі*.
Прага – Чэхія – *чэх* – *чэшскі*.
*Парыж* - Францыя – француз – *французскі*.
Ташкент – *Узбекістан* – узбек – *узбекскі*.
Душанбе – Таджыкістан – *таджык* – *таджыкскі*.
Астана – *Казахстан* – казах – *казахскі*.
Берлін – *Германія* – *немец* – *нямецкі*.

***6. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія***

- А зараз надышоў час падвесці вынікі нашай працы. Спадзяюся, што сённяшняе даследаванне ў лабараторыі было для вас цікавым і пазнавальным. Давайце яшчэ раз узгадаем, ад чаго залежыць правапіс суфікса ***-ск-*** у адносных прыметніках, на якія аспекты мы павінны звяртаць увагу?




**Закончыце выраз:**
Я магу пахваліць сябе за… .
Я не вельмі задаволены сабой, бо… .
Я хачу сказаць “дзякуй” свайму таварышу за… .
- Я таксама хачу сказаць усім вам “дзякуй”, даць выдатную ацэнку ўсім групам і паставіць адзнаку… .

**7.Дамашняе заданне**

*§ 39, пр.242*